ченьский, манастыр Светых Борыса Глеба на Белчыцы, манастыр Светого Юря. В случаях, когда объекты имели «уникальное» название, структура их именования специально упрощалась: так, манастыр Светого Петра потерял имя Павла. По этой же причине и название единственного католического монастыря имело лаконичную формулу: кляштора Бернардынского.

Наибольшее число названий монастырей, зафиксированных в ревизии, относятся к Верхнему замку Полоцка: Троицкий, Воскресенский, Машоночный и Петропавловский.

За одним исключением, все топонимы, обозначающие церковные объекты, принадлежали православной церкви, соответственно именно православный канон лежал в основе церковной топонимики Полотчине. Судя по представленным в ревизии экклезионимам, к наиболее почитаемым святым на Полотчины в середине XVI в. следует отнести Николая и Михаила. Значение экклезионимов для формирования топонимического пространства заключалось в том, что они, по сущности, являлись наиболее заметными топографическими ориентирами и сами по себе давали названия иным объектам: улицам (Илинская, Пятницкая) и переулкам (Вознесенский) Полоцка, элементам оборонительных сооружений (вежа Софейская, Богородицкая, городня Борысоглебъская).

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Полоцкая ревизия 1552 года / Ред. И.И. Лаппо.- М.: Унив. Тип., 1905. 257 с.
2. Тарасаў, С.В. Полацак IX-XVII стст.: Гисторыя и тапаграфия. Мн.: Беларуская навука ,1998. 193 с.

УДК 811.161.3

## НАЗОЎНІКІ З КАМУНІКАТЫЎНА АСЛАБЛЕНЫМ ЗНАЧЭННЕМ У ПРЭДЫКАТЫЎНАЙ ФУНКЦЫІ

**Данільчык З.П.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У сучаснай беларускай мове сустракаецца шмат канструкцый з састаўным іменным выказнікам, выражаным сінтаксічна непадзельнымі словазлучэннямі, адзін з кампанентаў якіх з'яўляецца назоўнікам з камунікатыўна аслабленым значэннем: А ён увогуле чалавек сур'ёзны (А. Савіцкі); Старасць – справа ненадзейная (А. Якімовіч) і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Як відаць з прыкладаў, выказнік у такіх сказах мае свае спецыфічныя асаблівасці. Па-першае, назоўнік аслабляе тут сваё значэнне ў камунікатыўным плане, а асноўную сэнсавую нагрузку нясе атрыбутыўны кампанент, што знаходзіцца пры ім. Па-другое, у выніку аслаблення значэння назоўнікам лагічны націск пераносіцца на прыметнік, які абавязковы ў такіх канструкцыях.

Прааналізуем, у якіх абставінах прэдыкатыўныя назоўнікі аслабляюць сваё значэнне, раскрыем спецыфіку іменнай часткі выказніка, выражанай спалучэннем "назоўнік + атрыбутыўны кампанент", вызначым семантычныя групы назоўнікаў, якія выступаюць у гэтай ролі.

Вылучэнне членаў у сказе залежыць ад сэнсавай накіраванасці выказвання, бо члены сказа – гэта сінтаксічныя катэгорыі, якія ўзнікаюць у сказе на аснове формаў словазлучэння і адлюстроўваюць адносіны паміж структурнымі элементамі сказа.

Пры выдзяленні членаў сказа патрэбна ўлічваць і той факт, што аналіз фармальна-граматычнай структуры сказа не павінен быць адарваным ад яго сэнсавай структуры. Сэнсавая накіраванасць у такіх канструкцыях заключаецца не ў аднясенні прадмета ці асобы да нейкай пэўнай родавай катэгорыі, а ў абазначэнні пэўных якасцей ці ўласцівасцей, што ў гэтым выпадку прыпісваюцца дзейніку. Напр.: Шведы – народ стрыманы (І. Мележ); Але жыццё – дужа складаная рэч (І. Новікаў).

У прыведзеных прыкладах назоўнікі народ, рэч поўнасцю не выражаюць прэдыкатыўнай прыметы. Сэнс выказванняў заключаецца не ў тым, каб адзначыць, што шведы – народ, а жыццё – рэч, а менавіта ў тым, які гэта народ шведы, якая гэта рэч жыццё. Прэдыкатыўную функцыю ў прыведзеных сказах выконваюць сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні народ стрыманы, дужа складаная рэч.

Канструкцыі, у якіх прэдыкатыўную функцыю выконвае спалучэнне "назоўнік + атрыбутыўны кампанент", неабходна размяжоўваць з тымі, дзе ў ролі выказніка гэты ж назоўнік ужываецца без прыметніка. Параўн.:

1. Скірмунт – чалавек важны і заможны пан (Я. Колас); Гэты твой папярэднік мужык учэпісты, як бульдог. З зубоў выдзярэ! (А. Савіцкі); Рыбацтва – тонкая справа (М. Лупсякоў).

2. Адзін старшыня калгаса ў яго чалавек, а гэты старшыня робіць у калгасе што хоча (П. Пестрак); Падахвоціўся грыбавік ды – прагнаў баразёнку. Гарадскі, а ў рабоце мужык, хоць і так сабе звонку (А. Вялюгін); Гэта яго справа, да якой другім няма ніякага дзела (Я. Колас).



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

У першай групе сказаў назоўнікі чалавек, мужык, справа з'яўляюцца галоўнымі ў граматычных адносінах і другаснымі ў камунікатыўным плане. Прыметнікі важны, учэпісты, тонкая – другасныя ў граматычных адносінах, але галоўныя ў камунікатыўным плане, бо нясуць асноўную сэнсавую нагрузку. Назоўнікі ж чалавек, мужык, справа ў другой групе параўнаных сказаў поўнасцю выконваюць сэнсавую нагрузку, семантычна поўна раскрываючы значэнні дзейнікаў, і не патрабуюць удакладняльных кампанентаў. Назоўнікі з аслабленым значэннем, як лічыць Л. П. Старасельцаў, "факт не лексічнага і не марфалагічнага, а сінтаксічнага парадку, абумоўлены супярэчнасцю паміж фармальна-сінтаксічным і актуальным чляненнем гэтых сказаў" [1, с. 9]. Выклікае цікавасць і той факт, што паміж назоўнікам і прыметнікам у такім выпадку як бы сціраецца паўза, назоўнік нібы зліваецца з атрыбутыўным кампанентам у адно слова.

Сярод прэдыкатыўных назоўнікаў з аслабленым значэннем можна вылучыць чатыры семантычныя групы:

1. Асабовыя назоўнікі, якія называюць людзей па розных прыметах (полу, узросту, сваяцкіх адносінах) і абазначаюць агульныя (родавыя) паняцці: чалавек, народ, людзі, хлопец, мужчына, дзіця, фігура і інш. Напр.: Мой бацька – чалавек круты і неразгаворлівы (Б. Сачанка); Лапко ў калгасе – відная фігура (Я. Колас).

2. Адушаўлёныя неасабовыя назоўнікі, якія абазначаюць агульныя (родавыя) назвы жывых істот у адносінах да дзейнікаў, што ўжыты для абазначэння відавых паняццяў: жывёла, звер, птушка, рыба, скаціна і інш.: А бусел – птушка, трэба сказаць, цікавая (А. Рылько); Шчупак – рыба хітрая (А. Шашкоў).

3. Неасабовыя канкрэтныя назоўнікі, што называюць агульныя (родавыя) паняцці ў адносінах да відавых (дзейнікаў): горад, грыбы, дрэва, зелле, расліна, рэч, справа (апошнія дзве лексемы ў значэнні 'прадмет') і інш.: Вільня, як вядома, — самы прыгожы горад (М. Гарэцкі); Адвечнае дрэва дуб (І. Шамякін); Жоўтагаловыя каласавікі – грыбы нядоўгія (І. Навуменка).

4. Абстрактныя назоўнікі, якія з'яўляюцца родавымі найменнямі, указаннямі ў адносінах да дзейнікаў, што называюць дзеянні, падзеі, факты, з'явы аб'ектыўнай рэчаіснасці: рэч, справа, пара, задача, штука, галіна, паняцце, прадмет і інш.: Сесія – самая цяжкая і, як ні дзіўна, самая вясёлая пара ў студэнтаў (У. Дамашэвіч); Сумленнасць – рэч нядрэнная (Л. Гаўрылкін).

Падсумоўваючы назіранні, можна зрабіць выснову, што прэдыкатыўныя назоўнікі з камунікатыўна аслабленым значэннем



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

шырока ўжываюцца ў мове і вызначаюцца семантычнай разнастайнасцю. У такіх канструкцыях адбываецца “паслабленне”, “страта” назоўнікам не яго лексічнага значэння, а толькі камунікатыўнай ролі ў сказе.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Старосельцев, Л. П. Предложения тождества в современном русском языке: автореф. дисс. … канд. филол. наук / Л. П. Старосельцев. – Л., 1971. – 19 с.

УДК 378. 663. 037:796.035 (476.60)

## ЭФФЕКТИВНОСТЬ ПРИМЕНЕНИЯ ЖОНГЛИРОВАНИЯ ДЛЯ ФОРМИРОВАНИЯ У СТУДЕНТОВ ТЕХНИКИ ВЛАДЕНИЯ МЯЧОМ В ФУТБОЛЕ

**Даньковская Т.В., Леонов И.Н.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Цель исследования − обосновать эффективность применения жонглирования на формирование техники владения мячом в футболе.

Для достижения поставленной цели в работе решались следующие задачи:

1. Изучить технику владения мячом в футболе.
2. Экспериментально обосновать эффективность применения жонглирования на формирование техники владения мячом в футболе.
3. Разработать практические рекомендации.

Техника футбола представляет собой совокупность специальных приемов, используемых в игре в различных сочетаниях для достижения поставленной цели.

Технические приемы − это средства ведения игры. От того, насколько полно владеет футболист всем многообразием этих средств, как умело и эффективно применяет их в рамках правил для решения конкретных тактических задач в вариативных условиях игровой деятельности, при противодействии игроков команды соперника, а часто и при прогрессирующем утомлении, во многом зависит возможность достижения высоких спортивных результатов. Искусное владение техникой - неотъемлемая часть всесторонней подготовки и гармоничного развития футболистов.

К критериям технического мастерства футболистов можно отнести следующие количественные и качественные показатели:

1. Объем и разносторонность, т.е. общее количество используемых в игре технических приемов и их широкое сочетание.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ